**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

**Хроніка**
**культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за чэрвень 2020 г.**

У чэрвені ў публічных бібліятэках ДУК стартаваў раённы конкурс летняга чытання «Летнее чтение с увлечением». У рамках конкурсу бібліятэкі праводзяць мерапрыемствы для дзяцей і падлеткаў.

**Мерапрыемствы ў рамках раённага конкурсу летняга чытання «Летнее чтение с увлечением»**

Да Міжнароднага дня абароны дзяцей **3 – 7 чэрвеня** ва ўсіх бібліятэках прайшлі святочныя мерапрыемствы з насычанай пазнавальна-гульнявой праграмай.

**3 чэрвеня**

На святочным калейдаскопе «Яркія фарбы дзяцінства» дзеці паўдзельнічалі ў конкурсах і гульнях «Як жывеш?», «Загадкіна», «Адгадай слова», «Хто большы», у віктарынах «Адгадай казку», «Па старонках любімых кніг», спартыўных спаборніцтвах. Лепшымі знаўцамі дзіцячай літаратуры сталі ўдзельнікі каманды «Усмешка», а ў спартыўных спаборніцтвах перамагла каманда «Апельсін».

*Стрыгаўская ПБ, 28 чал.*

**10 чэрвеня**

Літаратурнае свята «З днём нараджэння, Кніга» прайшло ў фармаце літаратурнай пляцоўкі ў двары бібліятэкі. Там працавала літаратурнае кафэ «Частуем смачнай кнігай», дзе чытачам прапаноўвалася «Меню для кнігаежак». Дзеці весела, з гульнямі правялі час на кніжнай палянцы «Пачытай-ка» і пабывалі ў круізе па кніжным акіяне, дзе наведалі астравы «Усёзнайкі», «Кнігачэі» і праплылі «Літаратурны заліў».

*Буховічская ПБ, 27 чал.*

**12 чэрвеня**

На гадзіне прававых ведаў «Проста свавольствы альбо хуліганства» ў бібліятэцы прысутныя даведаліся, у чым адрозненне свавольства ад хуліганства ці злачынства і якія іх наступствы. У гульнявой форме падлеткі вызначылі розныя жыццёвыя сітуацыі, якія парушаюць агульнапрынятыя меры паводзін. На мерапрыемстве паказаны відэаролік па прафілактыцы правапарушэнняў сярод моладзі, кожнаму ўручана памятка «Як не дапусціць правапарушэнне».

*Лукская ПБ, 17 чал.*

**14 чэрвеня**

У ходзе летняга рандэву «На досуге летним днём в руки книгу мы берём» у бібліятэцы дзеці пазнаёміліся з новымі кнігамі, з творчасцю дзіцячых беларускіх пісьменнікаў: У. Ліпскага, Г. Аўласенкі, Э. Агняцвет, Р. Баравіковай і інш. Прысутныя ўдзельнічалі ў конкурсах «Чый гэта партрэт», «Хто самы уважлівы». Юныя чытачы пабывалі ў гасцях у любімых казачных герояў, удзельнічаючы ў гульні-віктарыне «Россыпы цудаў».

*Гарадзецкі ф-л, 35 чал.*

**24 чэрвеня**

На свяце маленькіх чытачоў «Книжный сад для дошколят» дзеці здзейснілі падарожжа па казачным кніжным садзе, дзе на розных прыпынках выконвалі заданні, адгадвалі загадкі, гулялі ў гульні «Наадварот», «Пакружыся-павярціся», «Збяры букет», малявалі малюнкі пра лета.

*Балоцая ПБ, 19 чал.*

## <u>Іншыя мерапрыемствы</u>

**12 чэрвеня**

Бібліятэкар аддзела бібліятэчнага маркетынгу Наталля Ефціфеева стала пераможцам віктарыны «Ведай сваю спадчыну», прысвечанай традыцыям старадаўняга вяселля і адзенню свахі з вёсак Лелікава і Павіцце Кобрынскага раёна. Яна адзіная правільна адказала на ўсе пытанні віктарыны, прапанаваныя Кобрынскім ваенна-гістарычным музеем імя А. В. Суворава. *(Кобрынскі веснік, 2020, 13 чэрвеня; Кобрин-информ, 2020, 18 июня; Літаратура і мастацтва, 2020, 26 чэрвеня.)*

## <u>Выдавецкая дзейнасць</u>

**1 чэрвеня**

Бібліёграфамі цэнтральнай раённай бібліятэкі выдадзены бібліяграфічны даведнік «Па працы і пашана» ў межах праекта «Славутыя імёны маёй малой радзімы». Даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» прысвечаны асобам, якія ўдастоены дзяржаўных працоўных узнагарод, маюць званне «Заслужаны работнік» у розных галінах дзейнасці, лаўрэаты дзяржаўных прэмій.

*ЦБ*

**2 чэрвеня**

Аддзелам бібліятэчнага маркетынгу выданы зборнік вершаў члена літаратурнага клуба «ПоэтиКо» Міхаіла Чайнікава «Познакомлюсь с дамой средних лет», у які ўвайшлі вершы рознай тэматыкі.

*ЦБ*

Ефціфеева Н. П.
8-01642-3-85-81